ДК811.161.3’373:821.161.3 –31

***С. І. Жураўлёва***

# ПАРЦЭЛЯВАНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ
# У МОВЕ ТВОРАЎ І. НАВУМЕНКІ

*Артыкул прысвечаны аналізу парцэляваных канструкцый на матэрыяле мастацкіх твораў І. Навуменкі. На аснове фактычнага матэрыялу апісваюцца структурныя і граматычныя асаблівасці парцэлятаў. Вызначаны месца, значэнне парцэляцыі ў мове твораў пісьменніка.*

МГПУ им. И.П.Шамякина

У мове сучаснай беларускай мастацкай прозы шырока выкарыстоўваюцца парцэляваныя канструкцыі, сутнасць якіх заключаецца ў такім чляненні сказа, «пры якім змест выказвання рэалізуецца не ў адной, а ў дзвюх і больш інтанацыйна-сэнсавых канструкцыях, размешчаных адна за другой з працяглымі паўзамі» [2, 97].

Парцэляваная канструкцыя складаецца з дзвюх частак: базавай часткі і парцэлята. Базавая частка заўсёды выступае як самастойны сказ, а парцэлят знаходзіцца ў поўнай залежнасці ад яе як у сэнсавых адносінах, так і паводле сінтаксічнай функцыі і носіць характар дадатковага паведамлення, якое ўдакладняе, паясняе або развівае асноўнае выказванне. Можна пагадзіцца з тым, што «парцэлят з’яўляецца структурна ці семантычна залежным членам папярэдняга простага сказа або адчлененай часткай складанага і здольны функцыянаваць у маўленні толькі ў спалучэнні з базавай часткай» [4,9].

У мастацкіх творах І. Навуменкі выкарастоўваюцца розныя віды парцэляваных структур. Парцэляванымі з’яўляюцца як простыя сказы: *Па грыбах нехта ўправіўся пахадзіць.* ***Учора ці пазаўчора*** [5, т. ІІ, 79], так і складаныя: *Тыя, што на вайне ўцалелі, будучага жыцця не ўяўлялі без горада, інстытута, загадкава-ружовых даляў, якія пасля гэтага адкрываліся.* ***Бо яшчэ да вайны іх так выхавалі*** [6, 16–17]. Як сцвярджае Н. Д. Бандарэнка, «асноўную граматычную і сэнсавую нагрузку ў парцэляванай канструкцыі выконвае базавая частка, якая абавязкова з’яўляецца закрытай адзіночнай структурай, у той час як парцэлят цалкам залежыць ад яе і адрозніваецца структурнай адкрытасцю: можа вычляняцца столькі элементаў, колькі неабходна для перадачы таго ці іншага аб’ёму інфармацыі» [3,72].

Пры базавай частцы можа ўжывацца адзін або некалькі парцэлятаў: *Дзіўна: Андрушкевіч не крыўдзіцца.* ***Адчувае: дысертацыю напіша. Ідэй, фактаў мае аж залішне. Пакуль што не ўмее іх як трэба звязаць, падаваць, афармляць*** [6, 98].

Некалькі парцэлятаў, якія адносяцца да базавай часткі, могуць быць аднатыпнымі або разнатыпнымі. Аднатыпнымі з'яўляюцца парцэляты, якія маюць аднолькавую граматычную форму і выконваюць аднолькавую

сінтаксічную функцыю: *Цётка і жыве.* ***Мае знаёмства з базарам, прадае садавіну, ягады. Кватарантаў таксама не крыўдзіць*** [6, 114].

Разнатыпнымі называюцца парцэляты, якія адносяцца да базавай часткі, але маюць розную граматычную форму і выконваюць розныя сінтаксічныя функцыі: *Ён [Андрушкевіч] не паедзе – паляціць у Мінск.* ***Знойдзе таксі і ў аэрапорт! Зараз жа*** [6, 184].

Разнавіднасцю парцэляцыі з некалькімі парцэлятамі з’яўляецца паслядоўная парцэляцыя. Сутнасць яе заключаецца ў тым, што першы парцэлят адносіцца да базавай часткі, а другі – да першага парцэлята: *– На пенсіі я [Васіль].* ***Хоць яшчэ працую. Не ў шахце – наверсе*** [6, 212].

З пункту гледжання структуры ўсе парцэляваныя канструкцыі падзяляюцца на дзве групы: 1) парцэляваныя канструкцыі, якія пабудаваны на аснове членаў сказа; 2) парцэляваныя канструкцыі, пабудаваныя на аснове даданых частак.

Самымі распаўсюджанымі ў мастацкіх творах І. Навуменкі з'яўляюцца парцэляваныя канструкцыі, пабудаваныя на аснове членаў сказа. Сярод іх можна вылучыць наступныя структурныя тыпы:

1. Канструкцыі з парцэлятам-дзейнікам: Толькі на вуліцы не еш. А то калі ўбачаць, то набягуць. Казік, Юрка [5, т. II, 483]. Парцэлят тут выконвае ролю дзейніка, аднароднага з дзейнікам асноўнага выказвання.

Л. І. Бурак у кнізе «Далучэнне ў сучаснай беларускай мове» адзначае, што аднароднымі лічацца парцэляваныя дзейнікі, якія ў структуры складанага інтанацыйнага цэлага звязаны з адным і тым жа выказнікам. З’яўляючыся кампанентам стрыжнёвага сказа, гэты выказнік размяшчаецца перад непарцэляваным дзейнікам і дапасоўваецца да яго форм. Парцэляваныя дзейнікі, якія ўтвараюць «звышфразны» аднародны рад з непарцэляваным дзейнікам, на характар дапасавання не ўплываюць. Усе дзейнікі ў падобным радзе выражаюцца ў асноўным назоўнікамі, якія ўдакладняюцца часам прыметнікамі або лічэбнікамі. Абазначаючы прадмет і з'явы аб’ектыўнай рэчаіснасці, парцэляваныя дзейнікі кантактна прымыкаюць да непарцэляванага дзейніка – ён размяшчаецца ў канцы стрыжнёвага сказа – і часцей за ўсё прымацоўваюцца да яго пры дапамозе злучніка і: – Толькі на той чыгунцы розныя робяць. І лянівыя, і дбайныя [5, т. I, 454]; Самае страшнае – голад. І яшчэ холад [5, т. II, 458].

У выніку атрымліваецца закрыты рад аднародных дзейнікаў, які мае двухчленную або шматчленную будову [1, 188].

2. Канструкцыі з парцэлятам-выказнікам: – Пагаворым, – Мітусь весялее. – Пайду на пошту. Пазваню дадому [5, т. I, 152]; Вася ўжо ў трэці клас ходзіць. Але ўсё адно любіць гуляць у «цуркі», «ялавага», «кругавога», гнаць тоўстым дротам жалезнае колца і слухаць, як яно звініць, бегчы [7, 147]. Часта пісьменнік звяртаецца да паўтарэння ў парцэляванай частцы таго ж выказніка, які быў ужыты ў базавай частцы:

МГПУ им. И.П.Шамякина

Назаўтра Петруся білі. Білі шалепаламі [5, т. I, 86]; – Далёкія зорачкі!.. Вазьміце нас да сябе… Хутчэй вазьміце… [5, т. III, 325].

Парцэляцыя паўторных выказнікаў, нягледзячы на сваю шырокую распаўсюджанасць, ставрае толькі малую частку ад колькасці парцэляцыі аднародных выказнікаў. Часцей парцэляцыі падпарадкоўваюцца лексічна розныя выказнікі: Вазілі на поле лічанымі вазамі, а ў зводках пісалі пра сотні тон. Самі сябе ашуквалі. Торф, бадай, зусім не капалі. Прывозілі для прыліку па некалькі вазоў на гектар. Везлі сыры, прама з балота, цвёрдыя чорныя цагліны і цяпер валяюцца па полі [5, т. II, 323].

Ступень граматычнай злітнасці парцэляваных выказнікавых канструкцый з базавай часткай можа быць рознай. У большасці творах І. Навуменкі іх граматычная агульнасць вызначаецца адным дзейнікам, які знаходзіцца ў базавай частцы і абумоўлівае формы дапасавання парцэляванага выказніка, размешчанага ў другой фразе. Ён [Мікалай Аляксеевіч] хапіўся рукою за вушак і доўга стаяў, не адважваючыся сысці з ганка. Потым асцярожна саступіў на зямлю і паволі прайшоўся па двары [5, т. II, 334]; Але з такімі, як Міця, не лічыліся. З іх пасмейваліся [5, т. III, 177].

З’ява парцэляцыі адкрывае шырокія магчымасці для аб’яднання ў адной структуры марфалагічна розных выказнікаў. Як вядома, марфалагічна разнаформеныя аднародныя выказнікі сустракаюцца і ў межах адной фразы, але там такія спалучэнні нярэдка абмяжоўваюцца семантычнымі фактарамі. Парцэляцыя, аднак, дазваляе свабодна спалучаць разнаформеныя аднародныя члены.

У мове твораў І. Навуменкі сустракаюцца выказванні, у якіх выказнік базавай часткі і парцэлята маюць розныя формы часу. Такія выказванні асабліва наглядна дэманструюць канструктыўную ролю з’явы парцэляцыі ў выніку тэарэтычна магчымых сінтаксічных структур.

Выказванні гэтага тыпу будуюцца ў асноўным па схемах: *прошлы час – цяперашні час, прошлы час – будучы час:– А я [Клара] разышлася.* ***Жыву з сынам*** [5, т. I,255]; *– Як што – Вербічы ж спалілі.* ***Дабяруцца і да нас*** [5, т. III,357].

Аналіз парцэляваных выказнікавых канструкцый у мове твораў І. Навуменкі дазваляе зрабіць вывад, што ў поўнай адпаведнасці з часавымі значэннямі дзеяслоўных форм парцэлят у такіх выказваннях выражае дзеянне, якое адбываецца пасля дзеяння, названага ў базавай частцы.

Схема *закончанае трыванне – закончанае трыванне* часцей за ўсё выкарыстоўваецца для выражэння паслядоўнасці дзеяння або рада паслядоўных этапаў аднаго дзеяння: – *...Знайдзі прараба – франтавіка ці партызана.* ***Пагавары з ім…*** [5, т. III, 509]; *Прынёс праз дзень тры картачкі.* ***І дужа здзівіў фотакартачкамі Васю*** [7, 144].

На фоне схемы *закончанае трыванне – закончанае трыванне* ў мове твораў І. Навуменкі ўжываецца схема *закончанае трыванне – незакончанае*

*трываннеса значэннем паслядоўнасці дзеянняў: – Перадахні, дзядзька.* ***Хадзі да нас*** [5, т. I, 416]; *Але сукенкі з парчы яна [Рыта] не пашыла.* ***Усё адкладвала*** [5, т. II, 480].

Заўважаецца і другая распаўсюджаная схема парцэляцыі – *чаргаванне ў фразах незакончанага і закончанага трыванняў:– Круціць хвастом твая Вікця.* ***Знайшла другога, лепшага*** [5, т. III,365]; – *Ляжы.* ***Раніцай пойдзеш.*** *Хіба ў інтэрнаце лепш?* [5, т. III, 497].

І. Навуменка выкарыстоўвае сінтаксічныя структуры з аднароднымі парцэляванымі выказнікамі, якія могуць уключаць у свой склад спалучальныя злучнікі або не змяшчаць іх:

1)парцэляваныя структуры з бяззлучнікавым спалучэннем аднародных выказнікаў: – *Каханне – звычайная біялогія.* ***Сексуальныя эмоцыі. Цяга да размнажэння*** [5, т. III, 19];

2) парцэляваныя сінтаксічныя структуры са злучнікавым спалучэннем аднародных выказнікаў: *Якое б ні было на дварэ надвор'е, які б ні быў настрой, кожную вольную хвіліну ён [Кахаnoўскі] праводзіць у майстэрні.* ***Або едзе ў лес*** [6, 252]; *Пайковага цукру ім хапала на дзве першыя кружкі, астатнія – аж да дзесятай – яны пілі так, шчодра разбаўляючы кіпятком духмяным травяным настоем.* ***І маўчалі*** [5, т. I, 277– 278].

У прааналізаваных выказваннях злучнік *і,* акрамя сваіх звычайных функцый, выконвае і некалькі іншыя задачы: у малараспаўсюджаных выказваннях ён згладжвае рэзкасцьмоўнага разрыву; у вельмі распаўсюджаных выказваннях, дзе аднародныя выказнікі падзелены большай колькасцю слоў, злучнік падтрымлівае расцягнутыя граматычныя сувязі паміж аднароднымі выказнікамі.

3. Канструкцыі з парцэлятам-дапаўненнем.

Сярод парцэляваных канструкцый у мове твораў І. Навуменкі значную колькасць складаюць структуры з парцэлятам-дапаўненнем, якое можа быць як прамым, так і ўскосным, неразвітым і развітым.

Найбольшай прадуктыўнасцю вызначаюцца канструкцыі з парцэлятам – прыдзеяслоўным ускосным дапаўненнем развітай структуры: *Вася не любіць біцца.* ***Ні са сваімі братамі, ні з чужымі хлопцамі*** [7, 72]; – *Славяне, нават вашы палешукі сутыкаліся з антычным светам.* ***Са старажытнай Грэцыяй, Рымам*** [6,89].

Канструкцыі з парцэлятам – прыдзеяслоўным прамым дапаўненнем у творах ужываюцца не часта. Яны выражаюцца назоўнікамі ў форме вінавальнага склону без прыназоўніка: *Тады, у юнацтве, каханне абяцала ўсё.* ***Радасці, здзяйсненні, перамогі*** [6, 40].

Выкарыстанне парцэляваных канструкцый у дыялогах, маналогах, аўтарскай мове дапамагае пісьменніку акцэнтаваць увагу на асобных дэталях, надаць мове большую выразнасць, экспрэсіўнасць.

4. Канструкцыі з парцэлятам-азначэннем.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Паводле сваёй функцыі парцэляты-азначэнні набліжаны да інверсійных канструкцый: *Помсцячы мужу, развівае шалёную энергію, бегае, звоніць і нарэшце атрымлівае кватэру ў сваім інстытуце.* ***Двухпакаёвую*** [6, 124].

Парцэляваныя дапасаваныя азначэнні выражаюцца займеннікамі, лічэбнікамі: *Нас нават у газеце крытыкавалі.* ***У вашай…*** [5, т. II, 456]; *З бібліятэкі Андрушкевіч вяртаецца ў інтэрнат са знаёмымі аспіранткамі.* ***То з адной, то з другой*** [6, 101].

У мове твораў пісьменніка багатымі экспрэсіўнымі магчымасцямі валодаюць парцэляваныя недапасаваныя азначэнні. Экспрэсіўную яркасць набываюць азначэнні-парцэляты, выражаныя назоўнікамі ва ўскосных склонах: *За чыгункай – таксама лес.* ***Сасоннікі, беразнякі, дубовыя гаі*** [5, т. I, 142 – 143]; *Назаўтра я напісаў заметку ў газету.* ***Пра знішчальную рачулку і ўвогуле пра нядбайныя адносіны да прыроды*** [5, т. II, 91].

5. Канструкцыі з парцэлятам-прыдаткам.

Аўтар выкарыстоўвае іх для таго, каб падкрэсліць важнасць зместу парцэляванага прыдатка, выдзеліць прымету, перададзеную ім, надаць экспрэсіўную яркасць выказванню:

*– Вядома які. Калінін.* ***Усесаюзны стараста*** [5, т. I, 287]; *– Чуў, – паведамляе Клебановіч. – Цярэшчанка згрымеў.* ***Міністр асветы*** [6, 160]; *– Я Піліпенка Ілья.* ***Хвораст па-вулічнаму*** [6, 232]; *– Тут рукапіс кнігі. Ваенны журналіст напісаў.* ***Падпалкоўнік*** [6, 41].

6. Канструкцыі з парцэлятам-акалічнасцю.

Выбар форм марфалагічнай перадачы парцэляваных акалічнасцяў у творах не вызначаецца вялікай разнастайнасцю. З магчымых варыянтаў пісьменнік выбірае прыслоўі, формы ўскосных склонаў назоўнікаў з прыназоўнікамі і без іх. Апошнія ўжываюцца больш шырока, паколькі валодаюць магчымасцямі канкрэтызацыі акалічнаснага значэння: *Вася не любіць біцца.* ***Ні на вуліцы, ні тут у школе*** [7, 88].

Як і акалічнасць у простым сказе, парцэляваная акалічнасць можа выражаць розныя прыметы дзеяння, названага базавай часткай:

1) месца: *– Давай аб'яву.* ***У газету*** [6, 303]; *Калі няма дзе начаваць, то вольны ложак ёсць.* ***У маім пакоі*** [5, т. I, 317];

2) час: *Апошняе ён [Павел] не вельмі любіў.* ***Асабліва ў жніўную пару*** [6, 224]; *Пазнавата нешта ён дадому вярнуўся.* ***У сорак шостым годзе*** [5, т. II, 509];

3) прычыну: *Так, ледзь не ўсіх, хто стаіць на плошчы, Андрушкевіч ведае.* ***Вядома, па былых справах*** [6, 33]; *Знядобрым настроем едзе Павел у горад.* ***З-за сына*** [33,с. 219];

4) мэту: *Усе рвуцца ў горад.* ***Ад зямлі, травы, зялёных дрэў і кустоў на каменныя праспекты*** [6, 219];

5) спосаб дзеяння: *Што-небудзь спытаю, яна адкажа.* ***Ветліва, уважліва*** [5, т. I, 168];

МГПУ им. И.П.Шамякина

6) меру і ступень: – *Схадзі да Клімянка, пазыч запалак.* ***Паўкарабка*** [5, т. I, 449]; *Шлях у лесе разыходзіцца з чыгункай.* ***Але не болей як на паўвярсты*** [5, т. I, 454].

7. Канструкцыі з парцэлятам-удакладненнем канкрэтызуюць змест таго або іншага члена сказа ў базавай частцы: *Толькі на той чыгунцы розныя робяць.* ***І лянівыя, і дбайныя*** [5, т. I, 453]; *Усё даставаць трэба.* ***Лапці, касу, мянташку*** [5, т. II, 537].

8. Канструкцыі з парцэлятам-параўнальным зваротам: *Роўнае поле, і ўсё.* ***Як талерка*** [6, 202].

У мове твораў пісьменніка парцэляванымі з'яўляюцца як неразвітыя параўнальныя звароты: *Вандруюць па цёмных правулках, крадучыся, абдымаюцца.* ***Нібы школьнікі*** [6, 163],так і развітыя: *Тым часам, бясконца высвятляюць між сабой адносіны.* ***Нібы ім па васемнаццаць гадоў*** [6, 176].

Вялікую цікавасць уяўляюць канструкцыі, у якіх пісьменнік выносіць парцэляваную частку ў асобны абзац. У такім выпадку парцэлят набывае асаблівую сінтаксічную самастойнасць, асабліва моцнае логіка-семантычнае выдзяленне:

*Ён [дзед] наогул не любіць гаварыць. Можа, толькі з Васем.*

***Затое бабка Аўгіння не змаўкае ад ранку да вечара.*** *Бясконца пляце розныя гісторыі, часам вельмі смешныя* [7, 96].

У выніку парцэляцыі складаназалежных сказаў галоўная частка функцыянуе як просты сказ, а парцэляваная даданая частка набывае інтанацыю і семантычнае напаўненне самастойнага выказвання. Аддзяляючы даданую частку складаназалежнага сказа ад галоўнай, пісьменнік падкрэслівае тое дадатковае паведамленне, якое ўтрымліваецца ў даданай частцы, указвае на яго сэнсавую важнасць:

*У трэцім класе ёсць руская мова і літаратура.* ***Таму трэцякласнікі маюць таксама рускую хрэстаматыю і граматыку*** [7, 145].

Пры гэтым парцэляванай даданай частцы ўласціва фармальная і сэнсавая арганізацыя простага сказа. Але ў адрозненне ад простага сказа як камунікатыўнай адзінкі яна не мае галоўнай уласцівасці – сэнсавай (і інтанацыйнай) завершанасці асобнага паведамлення. Гэтай уласцівасцю валодае складаны сказ у цэлым. У любым складаным сказе яго часткі ўтвараюць камунікатыўнае цэлае. Таму нягледзячы на тое, што парцэляваная частка афармляецца як самастойны сказ, яна з'яўляецца семантычна недастатковай і захоўвае сэнсавую залежнасць ад галоўнай.

Парцэляваныя складаназалежныя сказы, ужытыя І. Навуменкам, характарызуюцца разнастайнасцю акалічнасных адносін паміж галоўнай і даданай часткамі. Часцей сустракаюцца канструкцыі:

1) парцэлят – даданая частка мэты, якая далучаецца да базавай часткі пры дапамозе злучніка ***каб***: *Мігайя го спецыяльна расстраляў.* ***Каб замесці сляды і паказаць немцам, што ён ім аддан*ы** [6, 264]; *Чыжэўскі*

МГПУ им. И.П.Шамякина

*начальства не любіць, таму і дарогі не хоча рамантаваць.* ***Каб меней да яго ездзілі*** [5, т. I, 498];

2) парцэлят – дададаная частка часу, якая далучаецца да базавай часткі пры дапамозе злучніка ***пакуль***: *Буду добра цэліцца.* ***Пакуль мяне не заб'юць*** [5, т. II, 495];

3) парцэлят – дададаная частка прычыны, якая далучаецца да базавай часткі пры дапамозе злучніка ***бо****: Вася марыць пра тую часіну, калі разам з Лізай пойдзе ў школу.* ***Бо ёй, як і яму, па сем гадоў*** [7, 12];

4) парцэлят – дададаная частка ўмовы, якая звязваецца з базавай часткай пры дапамозе злучніка ***каб***: *– Ай, кінь ты, маладзіца. Палічымся.* ***Каб толькі жывы былі*** [5, т. III,175];

5) парцэлят – дададаная частка ўступкі, якая далучаецца да базавай часткі пры дапамозе злучніка ***хоць****: У хляве ў такія хвіліны трывожыцца жывёла: іржэ конь, нема раве карова.* ***Хоць ваўкі да вуліцы Савецкай, на якой жыве Вася з Адамам, ніколі не дасягаюць*** [7, 11].

Для ўзмацнення паведамлення, якое шляхам параўнання паясняе і ўдакладняе тое, пра што гаворыцца ў базавай частцы, аўтар ужывае парцэляты – дададаныя параўнальныя часткі: *У дзверы, да якіх прысунуты Міцеў ложак, ціха, але настойліва стукаюць.* ***Нібы мыш у закутку варочае кавалак сухара*** [5, т. III, 304]; *Ніхто з Кавенек не паехаў у Германію.* ***Нібыта ўсе захварэлі*** [5, т. III, 340].

Большасць парцэляваных складаназалежных сказаў, якія сустракаюцца ў творах І. Навуменкі, вызначаецца агульнасцю некаторых рыс. Па-першае, парцэлююцца складаназалежныя сказы расчлянёнай будовы, галоўная частка якіх мае завершаную структуру і закончаны сэнс. Па-другое, парцэлюецца толькі тая частка, якая знаходзіцца ў постпазіцыі да галоўнай. Пры гэтым яна набывае значэнне дадатковага паведамлення, удакладнення.

Аналіз парцэляваных канструкцый у мове твораў дазваляе зрабіць вывад, што парцэляцыя ўжываецца І. Навуменкам як арыгінальны сінтаксічны прыём, які дапамагае значна пашырыць структуру сказа, паглыбіць яго агульную семантыку за кошт развіцця, удакладнення асобных членаў базавай часткі. Прыём парцэляцыі дае магчымасць утварыць вялікія разгорнутыя выказванні, якія ўдакладняюцца рознымі дададанымі сказамі, устаўнымі канструкцыямі. Дзякуючы парцэляцыі аўтар пазбягае празмернага ўскладнення структуры, павялічвае пры гэтым яе сэнсавы, інфармацыйны аб'ём. Пісьменнік нездарма шырока выкарыстоўвае гэтыя сінтаксічныя канструкцыі, бо яны з'яўляюцца яркімі мастацка-выяўленчымі сродкамі, з іх дапамогай перадаецца багацце сэнсавых і эмацыянальна-экспрэсіўных значэнняў.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Літаратура

1. Бурак, Л. І. Далучэнне ў сучаснай беларускай мове / Л. І. Бурак. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1975. – 256 с.

2. Рагаўцоў, В. І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: дыскусійныя пытанні / В. І. Рагаўцоў. – Мінск: Універсітэцкае, 2001. – С. 152.

3. Бандарэнка, Н. Д. Парцэляваныя канструкцыі ў аспекце агульных праблем тэорыі сінтаксісу / Н. Д. Бандарэнка // Беларуская лінгвістыка. – Мінск : Бел. навука, 2004. – Вып. 54. – С. 72 –80.

4. Сербина, Т. Г. Парцелляция как особое синтаксическое явление в языке современных газет: автореф. дис. … канд. филол. наук / Т. Г. Сербина. – Воронеж, 1988. – 16 с.

5. Навуменка, І. Збор твораў у шасці тамах / І. Навуменка. – Мінск: Маст. літ., 1981 – 1985. – Т. 1 – 5.

6. Навуменка, І. Асеннія мелодыі: раман, апавяданні / І. Навуменка. – Мінск: Маст. літ., 1987. – 318 с.

7. Навуменка, І. Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва: аповесці / І. Навуменка. – Мінск: Юнацтва, 1997. – 528 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина